# КАВАЛАК ПІРАГА ДЛЯ ТВОРЦЫ

**НАТАЛЛЯ ШАРАНГОВІЧ**



Год 2005-ы ў нашым выяўленчым мастацтве вызначыўся вялікай колькасцю разнастайных падзей. Адкрываліся выставы, адзначаліся юбілеі, выпускаліся альбомы і календары.

Але, безумоўна, галоўнай падзеяй было і застаецца аздабленне інтэр'ераў новай Нацыянальнай бібліятэкі. Колькі спрэчак разгарнулася вакол гэтага, самога па сабе прыемнага, факта! Нарэшце наша дзяржава пабудавала архітэктурны аб'ект, які ад пачатку задумваўся як сапраўдны сінтэз мастацтваў. І прапанавала ўпрыгожыць сотні квадратных метраў не карцінамі з запаснікоў, што было б нашмат прасцей і бестурботней. Узнік даўно чаканы прэцэдэнт: новыя творы айчынных жывапісцаў, скульптараў, манументалістаў, графікаў аказаліся рэальна запатрабаванымі. Гаворка пайшла пра дамовы з творцамі. Праўда, там, дзе маюцца на ўвазе грошы, пачынаюцца спрэчкі. 1 мая бібліятэка павінна адкрыцца, і адкрыцца з завершаным варыянтам унутранага аздаблення, а мастакі ўсё ніяк не могуць прыйсці да згоды і канчатковага паразумення.

На жаль, у творчым асяродку такія канфлікты — не рэдкасць. Пры арганізацыі любой рэспубліканскай выставы першае пытанне, якое большасць мастакоў задаюць кіраўніку творчай арганізацыі, гучыць аднолькава: ці будуць закупкі? І калі адказ адмоўны, то відочна гасне ў вачах агеньчык зацікаўленасці. На жаль, усведамленне каштоўнасці ўдзелу ў выставе, каштоўнасці глядацкай увагі, творчага абмеркавання страчваецца ў творчым асяродку. І гэтая сітуацыя ўзнікла не ўчора і не заўчора — выспявала цягам дзесяцігоддзя. Змяніць яе можа толькі павага дзяржавы да мастакоў і мастакоў — да саміх сябе. І тады не трэба будзе нецывілізаваным спосабам вырываць адно ў аднаго кавалак пірага. Бо яго сапраўды хопіць усім.